# ДВОЕ ДАРОСЛЫХ І ЧАЦВЁРА ДЗЯЦЕЙ

## У Пінскім раёне ўвекавечылі памяць сям'і, якую акупанты спалілі зажыва

Невялікі помнік устаноўлены ў полі, на месцы гібелі ні ў чым не павінных людзей. Гэта была сям'я з вёскі Церабень, Таццяна і Пётр Кахновічы гадавалі чацвёра дзяцей узростам ад 6 да 13 гадоў.




Ім нават стандартнае абвінавачванне ў сувязях з партызанамі не маглі прад'явіць, бо не было ніякіх доказаў. Іх катавалі паказальна, каб настрашыць іншых, знішчылі за тое, што гаспадар пасмеў пярэчыць солтысу-калабаранту. Цэлы карны атрад СС прыбыў на месца ў ліпені 1943 года. Таццяну, Пятра і іх дзяцей замкнулі ў доме на хутары, сцены абклалі саломай і падпалілі. Як указана ў паказаннях сведак дакумента, датаванага 1945 годам, да пажарышча нікога не дапускалі, пакуль там не засталося папялішча.

...Прайшло шмат гадоў, пайшлі з жыцця сведкі, і доўга пра сям'ю Кахновічаў ніхто не ўспамінаў. Але ў рабочую групу Пінскага раёна па садзейнічанні расследаванню крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа звярнулася жыхарка вёскі Церабень. Жанчына ўказвала на размешчаны ў полі невялікі слуп, які, паводле яе слоў, некалі паставілі ў памяць аб той трагедыі.

Інфармацыю сталі правяраць, і ў адным з архіваў знайшліся дакументы 1945 года, дзе значыліся запісы апытанняў сведак. Так высветлілі падрабязнасці той трагедыі. Інфармацыя была перададзена ў Пінскую міжраённую пракуратуру. Пазней нарадзілася ініцыятыва нераўнадушных грамадзян абазначыць гэта месца мемарыяльнай дошкай, памятным знакам.

Паводле слоў **старшыні Бобрыкаўскага сельскага Савета Аляксандра БАНЦЭВІЧА**, фінансаванне сціплага абеліска, добраўпарадкаванне тэрыторыі цалкам узяло на сябе мясцовае сельгаспрадпрыемства — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сцісха Пінскае».

Замест былога цэментнага слупа ўстаноўлены тыпавы помнік з агароджай, на якім увекавечаныя імёны і прозвішчы пакутнікаў. На цырымонію адкрыцця прыйшлі людзі з навакольных вёсак, школьнікі і педагогі, сваякі сям'і Кахновічаў, якая загінула ад рук карнікаў. У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір КАЛЕСНІКОВІЧ, Пінскі міжраённы пракурор Дзмітрый ПАЗНЯК**, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота тэлеграм-канала Пінскага райвыканкама.**